**Вашкевіч, А.** Ён хату пакінуў, пайшоў ваяваць / А. Вашкевіч // Ленінскі сцяг (Лепель). — 1989. — 18 ліп. — С. 2.

## ЁН ХАТУ ПАКІНУЎ, ПАЙШОЎ ВАЯВАЦЬ



Ефрасінні Фядосаўны, маці, дома не было. У вясковай хаце, напоўненай праз адчыненае акно водарам сена, толькі што падвезенага да пуні з поля, мы гутарым са старэйшым братам Васіля – падпалкоўнікам Савецкай Арміі Жарнасекам, які прыехаў у водпуск. Ваенным, як гаворыцца, не дазволена плакаць па статуту. Стрымліваецца і падпалкоўнік. Толькі дрыжэнне пальцаў рук выдае душэўнае хваляванне.

У гэтай вясковай хаце вырасла чатыры браты. Ввсіль быў трэці. Прыклад старэйшага – Мікалая – быў для яго вызначальным у жыцці. Вырашыў абраць прафесію ваеннага. Паехаў у вучылішча. Ды так атрымалася, што дзесьці згубілася адна даведка. З-за яе і не дапусцілі да экзаменаў. Але не адступіў ад свайго Васіль – пайшоў служыць прапаршчыкам.

Сярод братоў павялося так: у час водпускаў збірацца ў матчынай хаце. Весела было тады. Пасадзіць маці дужых сыноў за стол, а сама любуецца імі. Добра на душы ў такі час. Сыны прыязджалі не гасцяваць. Падладзяць сялібу, нарыхтуюць сена, дроў. Словам, зробяць усё на ўвесь год.

– У апошні свой прыезд заўважыў за Васілём многа незвычайнага раней, – успамінае М. Жарнасек. – Быў ён заўсёды вясёлы, кемлівы на жарты, кіраваў намі і за сталом, і ў працы. Цяпер жа задумёны. Я разумеў: ён у думках быў там, у Афганістане, дзе засталіся яго салдаты. Ён не гаварыў пра тое, як там на самой справе. Не многа і я ведаў, хоць і сам ваенны. Бо, як вядома, на першых гадах вайны пра Афганістан гаварылі мала, трымалі падзеі ў сакрэце. А там жа ішла сапраўдная вайна, гінулі людзі – нашы салдаты і афіцэры.

Васіль прыехаў пасля шпіталя. Вось як ён расказваў пра гэты эпізод, у час якога яго паранілі.

Год службы быў ужо за плячамі. Прапаршчык заслужыў водпуск. Хутчэй дамоў, у родныя Падымхі. Пайшоў на склад, каб здаць пісталет. Як на тое, не застаў загадчыка. Пачаў шукаць яго Толькі адышоў крокаў з сотню, як той склад узняўся ў паветра. Была гэта дыверсія ці няшчасны выпадак –не ведаю. Асколкі ад выбуху пасеклі цела.

– А ў якіх войсках служыў ваш брат?

– Я не ведаю дакладна, да якога воінскага падраздзялення адносілася яго часць, ведаю, што камандаваў ён гаспадарчым узводам. На той вайне гэта была небяспечная служба. Не на танку ці бронетранспарцёры, а на аўтагрузавіку ездзіў ён па афганскіх дарогах, дзе падсцерагалі засады, міны. Дастаўляў прадукты, іншае, што неабходна воіну.

— Якая рыса найбольш вызначала брата?

– Ёе вельмі хутка сыходзіўся з людзьмі ўвогуле. Калі характарызаваць адным словам, то лепшага, чым «кантакты», не падбяру…

Ведаючы, што М. Жарнасек кадравы ваенны, пацікавіўся, як ён ставіўся да героя-афганца, як камандзір да камандзіра.

– Васіль быў камандзір ад прыроды. Мне яго якасцей не хапае, не дадзена ад прыроды. Ён вельмі любіў салдат, магчыма, так, як старэйшы брат малодшага. Ён мог стаць выдатным камандзірам.

Як вядома, у пісьмах не дазвалялася гаварыць пра баі. А яны ішлі там часта. У час сустрэчы мы дамовіліся з Васілём, што ён будзе ставіць у канцы пісьма лічбу, якая будзе абазначаць колькасць забітых нашых воінаў у баях. Дык вось скажу, што пад кожным пісьмом адтуль стаяла пэўная лічба.

Трывога за Васіля, за іншых нашых воінаў расла ў бацькоў, усіх савецкіх людзей. У другі вотпуск мы не сабраліся разам: Васіль загінуў у час абстрэлу іх палявога лагера душманамі…

Пахавалі прапаршчыка Васіля Іванавіча Жарнасека на могілках ля вёскі Вялікі Поўсвіж, там ля самага бальшака цяпер бачна чорная гранітная пліта. Кожны звяртае ўвагу на яе, калі праязджае міма. Камуніст Жарнасек выканаў інтэрнацыянальны абавязак сумленна.

У вядомай песні М. Святлова спяваецца таксама пра інтэрнацыяналістаў. Перафразіруючы яе, можна сказаць: ён хату пакінуў, пайшоў ваяваць, каб у далёкім Афганістане зямлю сялянам аддаць.

**А. Вашкевіч**

**На здымку**: браты Жарнасекі (Васіль другі справа)